| ***Літара*** | ***Пытанне*** | ***Адказ*** |
|---|---|---|
| **А** | Большасць твораў Васіля Быкава напісана ў жанры… | *аповесці* |
| **Б** | Васіль Быкаў нарадзіўся ў вёсцы… | *Бычкі* |
| **В** | Тэматыка ранніх апавяданняў, як і многіх далейшых твораў Васіля Быкава, прысвечана падзеям … | *вайны* |
| **Г** | Пасля дэмабілізацыі з 1947 года Васіль Быкаў жыў і працаваў у … | *Гродне* |
| **Д** | Апошняй у творчасці В. Быкава стала кніга … | *"Доўгая дарога дадому"* |
| **Е** | Імя Васіля Быкава вядомае не толькі ў …, але і ва ўсім свеце. | *Еўропе* |
| **Ж** | У аповесці … аўтар апісвае некалькі гадзін з жыцця ізаляванай групы салдат, якая атрымала амаль немагчымае заданне абараніць чыгуначны пераезд, каб прыкрыць адыход асноўнай часткі савецкіх сіл. | *"Жураўліны крык"* |
| **З** | У 1986 годзе атрымаў Ленінскую прэмію за аповесць … | *"Знак бяды"* |
| **І** | Нацыянальнасць дзяўчыны Джуліі, галоўнай гераіні твора "Альпійская балада" … | *італьянка* |
| **К** | У 1939 годзе скончыў 8 класаў … сярэдняй школы | *Кубліцкай* |
| **Л** | Увосень 1943 года прысвоена званне малодшага | *лейтэнанта.* |
| **М** | З дзяцінства Васіль Быкаў захапляўся … | *маляваннем* |
| **Н** | Калі жыў і працаваў ў горадзе Гродна, на левым беразе ракі … меў гараж, дзе захоўваў тэхніку, у тым ліку маторную лодку, на якой любіў вандраваць па рацэ. | *Нёман* |
| **О** | Дзейнасць Васіля Быкава неаднаразова была адзначана дзяржаўнымі ўзнагародамі – ганаровымі званнямі, прэміямі, … і медалямі. | *ордэнамі* |
| **П** | У студзені 1944 года бацькі атрымалі…, у якой паведамлялася, што іх сын загінуў на фронце. | *пахаронку* |
| **Р** | Маці пісьменніка Ганна Рыгораўна была дачкой … | *рыбака* |

| | | |
|---|---|---|
| **С** | Вучыўся на …аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча, але не скончыў яго з-за адмены … | *скульптурным, стыпендыі* |
| **Т** | Імя галоўнай гераіні апавядання В. Быкава, маці, што на працягу шаснаццаці год пасля вайны чакае вяртання свайго сына | *Тэкля* |
| **У** | Сам аўтар лічыў, што найбольш удалай экранізацыяй яго твораў стаў фільм … , зняты рэжысёрам Л. Шапіцька паводле аповесці «Сотнікаў». | *"Узыходжанне"* |
| **Ф** | У 1998 годзе Васіль Быкаў разам з жонкай вырашыў пажыць у … | *Фінляндыі* |
| **Х** | Першы зборнік … (1960) раскрывае пасляваеннае жыццё савецкіх людзей. | *"Ход канём"* |
| **Ц** | Прозвішча героя твора, збеглага з лагера зняволенага простага, мужнага і гераічнага беларускага хлопца | *Цярэшка* |
| **Ч** | Улетку 1942 года Васіль Быкаў быў прызваны ў … | *Чырвоную Армію* |
| **Ш** | Вялікая Айчынная вайна заспела Васіля Быкава на Украіне ў горадзе… | *Шостка* |
| **Э** | У чэрвені 1941 года экстэрнам здаў… за дзясяты клас. | *экзамены* |
| **Ю** | З дзеючай арміяй прайшоў Румынію, Балгарыю, Венгрыю, …, Аўстрыю — старшым лейтэнантам, камандзірам узвода палкавой, потым армейскай артылерыі. | *Югаславію* |
| **Я** | Аповесць Васіля Быкава, выдадзеная ў 1975 годзе ў часопісе "Маладосць". | *"Яго батальён"* |